**Урок беларускай літаратуры ў 8 класе**
**Правяла: Дабравольская Т.П., настаўніца беларускай мовы і літаратуры**

**Тэма: ГЕНРЫХ ДАЛІДОВІЧ. АПАВЯДАННЕ «ГУБАТЫ»**
**Мэта: мяркуецца, што напрыканцы ўрокаў вучні:**
**будуць ведаць:** ідэйна-мастацкі змест і сюжэт апавядання «Губаты», засяродзіўшы ўвагу на душэўным стане, паводзінах і адчуваннях герояў;
**авалодаюць паняццямі:** апавяданне, навела;
**удасканаляць навыкі:** работы з апорным кластарам, мастацкім творам (эпічным).
**Задачы выхавання і развіцця асобы вучняў:** стварыць умовы для абуджэння пачуцця гуманных адносін да ўсяго жывога, адказнасці і абдуманасці ў дзеяннях і ўчынках; развіцця інтэлектуальных здольнасцей, аналітычнага мыслення вучняў, навыкаў слухання і канспектавання; садзейнічаць выхаванню маўленчай культуры вучняў.
**Абсталяванне:** партрэт Генрыха Далідовіча; выстава кніг апавядання «Губаты» розных гадоў выдання; відэаролікі «Апавяданне» і «Навела».
**Эпіграф: Без чалавечнасці — не будзе вечнасці... (Пімен Панчанка)**

**Ход урока**
**I. Арыенціровачна-матывацыйны этап.**
1.1. Арганізацыйны момант. Стварэнне псіхалагічнага настрою.
1.2. Актуалізацыя раней вывучанага.
**II. Пазнавальны этап.**
**2.1.Паглыбленне ў тэорыю літаратуры.**
А.Дэманстрацыя відэаролікаў «Апавяданне» і «Навела».
Б. Работа з вучэбным дапаможнікам. Чытанне артыкула «Апавяданне і навела».
В.Складанне апорнага канспекта.
**2.2. Слова настаўніка.**
**Заўжды, заўжды, усюды, кожны міг,**
**З жыццём усім, з якім навечна ў згодзе,**
**Ад самых шчырых роздумаў сваіх**
**Мне пакланіцца хочацца прыродзе...**

Кожнаму з нас варта выканаць просьбу Кастуся Кірыенкі і пакланіцца прыродзе за тое, што яна дорыць нам жыццё, асалоду, радасць. А ці заўсёды мы адносімся да прыроды так, як яна таго заслугоўвае?

«Прырода — найцікавейшая кніга, якая разгорнута прад вачамі кожнага з нас. Чытаць гэту кнігу, умець адгадаць яе мна- галучныя напісы — хіба ж гэта не ёсць шчасце?» — адзначыў Якуб Колас.

У гэтым творы закранаюцца складаныя этычныя праблемы ўзаемаадносін чалавека і прыроды, дапамагае нам, чытачам, задумацца, паразважаць, зрабіць пэўныя маральныя высновы.

Пранікнуты спагадай да жывой прыроды, твор хвалюе чытачоў, не толькі выклікае шкадаванне і сумны роздум, але і прымушае падумаць

кожнага над сваімі паводзінамі і ўчынкамі ў адносінах да жывых істот, да дзікіх і хатніх жывёл.

Апавяданне пераконвае нас, што чалавек не мае права быць жорсткім, заставацца абыякавым да прыроды. Гуманныя адносіны да ўсяго жывога ўзбагачаюць асобу чалавека, робяць яго высакародным, абуджаюць найлепшыя чалавечыя якасці.

**Твор мае важнае выхаваўчае значэнне:** ён адкрывае перад намі багаты духоўны свет чалавека і прыроды, вучыць актыўна ўмешвацца ў жыццё, абараняючы дабро.

Своеасаблівасць творчай манеры пісьменніка заключаецца ў тым, што ён не толькі перадае эмацыянальна-псіхалагічны стан людзей праз іх учынкі, паводзіны, думкі, але і як бы ўкладвае гэтыя чалавечыя адчуванні ў свядомасць маленькага ласяняці па мянушцы Губаты.

**2.3. Калектыўнае каменціраванае чытанне апавядання «Губаты» Г. Далідовіча.**

**2.4. Тлумачэнне сэнсу незразумелых слоў.**

**2.5. Вывучэнне першаснага чытацкага ўспрымання.**

- ✓ Якое ўражанне выклікаў у вас прачытаны твор? Які настрой?
- ✓ Які момант у творы вас найбольш уразіў / усхваляваў / абурыў? Чаму?

**2.6. Хвілінка адпачынку.**

**2.7. Гутарка.**

- ✓ Якое здарэнне адбылося з маленькім ласянём?
- ✓ Знайдзіце ў тэксце першай часткі апавядання словы, з якімі ляснік звяртаецца да ласяняці, зачытайце іх. Як гэтыя словы характарызуюць чалавечыя якасці лесніка?
- ✓ Раскажыце, калі ласка, якую дапамогу аказвае ляснік ласяняці.
- ✓ Як малюе пісьменнік жонку, дзяцей лесніка, раскрывае іх адносіны да ласяняці? Зачытайце адпаведныя радкі з твора. Як вы ацэньваеце паводзіны герояў твора, якім людзям яны ўласцівы?
- ✓ Раскажыце пра жыццё Губатага ў лесніка.
- ✓ Знайдзіце і зачытайце ўрывак, дзе апісваюцца пачуцці ласяняці. калі ён упершыню трапляе на волю, у родны лес.
- ✓ Губаты вяртаецца. Як сустракаюць яго дзеці? Якія пачуцці ў вас выклікае сцэна іх сустрэчы?
- ✓ Ці падтрымліваеце вы дзяцей, якія дакаралі бацьку, што «Губаты не ўцёк сам, а ты яго выпусціў. Як выпусціў бусла, зайчыкаў, дзікіх парасят»?
- ✓ Якім стаў Губаты, перажыўшы зіму ў лесніка? Зачытайце радкі з тэксту.

— Ці дапамагаюць пейзажныя малюнкі раскрыць адчуванні ласяняці?

**2.8. Калектыўнае складанне плана апавядання (план запісваецца настаўнікам на дошцы, а вучнямі — у сшытку).**

**Прыкладны план твора:**

1. Сумнае здарэнне з маленькім ласянём.
2. Сустрэча з леснікам.
3. Жыццё ласяняці (Губатага) у сям’і лесніка.
4. Спроба лесніка вярнуць Губатага ў звыклы для яго свет.

5. Смерць.

**2.9. Падрабязны пераказ зместу твора (ланцужком).**

**2.10. Гутарка.**

- ✓ Хто галоўны герой апавядання «Губаты» Г. Далідовіча?
- ✓ Чаму, на вашу думку, пісьменнік зрабіў галоўным героем не чалавека, як гэта звычайна бывае ў эпічных творах, а жывёлу, ласяня Губатага?
- ✓ Якімі мастацкімі прыёмамі найчасцей карыстаецца пісьменнік для стварэння яскравых мастацкіх вобразаў? Дакажыце гэта, зачытаўшы адпаведныя радкі з тэксту.
- ✓ Як звяртаюцца да Губатага члены сям'і лесніка? Зачытайце адпаведныя радкі.
- ✓ Як гэтыя словы характарызуюць усіх членаў сям'і?
- ✓ Каго на падвор'і лесніка Губаты не ўзлюбіў? Чаму?
- ✓ Ці мае рацыю ляснік, калі звяртаецца да дзяцей з такімі словамі: «Добра вы робіце, дзеці, і нядобра... Хораша і люба, што гледзіцё так Губатага, але блага, што трымаеце. Ён звер і павінен жыць у лесе. Там яго дом. Пасцель, яда, воля... Цяжка бывае дзікаму зверу, калі яго залішне прыручаць людзі... Гора бывае, бяда... Я ж ведаю...».
- ✓ Прачытайце ўрыўкі з апавядання: «На зіму яго паставілі ў невялікую загарадку ў хляве, да якога ён доўга не мог прывыкнуць: неяк муляла суседства з каровай і свіннямі»; «Вясной... Губаты засумаваў, не мог больш стаяць у паменшанай ад гною загарадцы, многа есці, спаць ці паціху хадзіць па двары...»; «Ён разагнаўся, стукнуўшыся галёнкай, перагойснуў загарад і радасна пабег па знаёмым выгане ў лес». Як праз апісанні ўмоў, у якіх жыў Губаты, пісьменнік перадае яго нораў?
- ✓ Што адчуў Губаты, апынуўшыся на волі?
- ✓ Да чаго падрыхтоўвае пісьменнік чытача, расказваючы пра пачуцці Губатага на волі?
- ✓ Перачытайце эпізод размовы браканьераў. Якія пачуцці выклікае ў вас сцэна гібелі Губатага?
- ✓ Якая асноўная праблема апавядання Генрыха Далідовіча «Губаты»?
- ✓ Як сам аўтар ставіцца да гісторыі з Губатым?

**2.11. Работа ў парах.**

**2.11.1. Агучванне праблемнага пытання настаўнікам.**

- ✓ **Чаму людзі забілі Губатага?**

**Чалавек у адносінах да прыроды**

↙ ↘

**Абаронца** **Спажывец**

**У апавяданні мы бачым з вамі гэтыя два тыпы адносін чалавека да жывёльнага свету.**

- ✓ **Прыгадайце эпізоды з твора, у якіх людзі праяўляюць сябе як абаронцы, памочнікі прыроды, і як спажыўцы.**
- ✓ **Ласяня, гарэзлівае, вясёлае, чулае да ласкі і дабрыні, нягледзячы на ўсе намаганні лесніка, загінула? Як вы думаеце, ахвярай чаго стаў**

**Губаты?**

**Губаты-ахвяра**

Чалавечай ласкі і дабрыні ← → чалавечай жорсткасці і спажывы

**2.11.2. Асэнсаваны першасны / другасны выбар.**
**Прыкладныя варыянты адказаў (запісваюцца на дошцы):**
1. Губаты — «хатнік» і не прывык жыць у лесе.
2. Лось прывык з даверам ставіцца да людзей.
3. Бессардэчныя браканьеры.
4. Лёгкая нажыва.
5. Зайздрасць іншых паляўнічых.
6. Імкненне чалавека да багацця згубіла жывёлу.
7. Узбагачэнне знешняе, выміранне духоўнае.
2.11.3. Выніковае абмеркаванне.
**2.12. Работа ў парах.**
**Заданне. Складзіце сюжэтную табліцу па апавяданні «Губаты» Генрыха Далідовіча.**

| Хто? | Што? | Дзе? | Калі? | Чаму? |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

(Агучваюцца вынікі работы.)
**2.13. Афармленне выставы творчых работ. Абарона па меркаванні настаўніка.**
**2.14. Разрыў. Зварот да міжпрадметных сувязей (жывапіс).**
- ✓ Прапаную звярнуць увагу на рэпрадукцыю карціны «Нечакана» Таццяны Данчуравай. Якая колеравая гама прадстаўлена ў творы жывапісу?
- ✓ Ці падыходзіць прапанаваны твор выяўленчага мастацтва да твора літаратуры?
- ✓ Якія пачуцці ўзнікаюць у вас пры праглядзе карціны Т. Данчуравай? Ці супадаюць яны з вашымі ўражаннямі ад апавядання «Губаты» Г. Далідовіча?
- ✓ Паразважайце, чым блізкія у сваім асэнсаванні свету прыроды мастачка Т. Дапчурава і пісьменнік Г. Далідовіч?

**2.15. Выразнае чытанне вучнямі ўрыўка з твора (эпізод на выбар вучняў).**
**2.16. Работа з кластарам.**
**Заданне.** Звярніце ўвагу на змест апавядання «Губаты». Скажыце, чым адрозніваецца ён па форме ад ужо вядомых вам эпічных твораў. На аснове прачытанага твора запоўніце апорную ехему:




(Агучваюцца вынікі работы.)

**III. Кантрольна-карэкцыйны этап.**

**3.1.Асэнсаванне.**

- ✓ Чаму чалавек павшен несці адказнасць за тых, каго прыручыў?
- ✓ Чаму жыццё дзікага звера ў няволі — здзек з жывой прыроды?
- ✓ На чым трымаюцца ўзаемаадносіны герояў і іхляснога сябра?
- ✓ Чаму вучыць нас апавяданне «Губаты»?

**3.2. Зварот да эпіграфа.**

- ✓ **Зачытайце словы Пімена Панчанкі. Як вы іх разумееце?**

**IV. Дамашняе заданне.**

- ✓ Адказаць на пытанні, змешчаныя ў вучэбным дапаможніку. Стварыць анатацыю-рэкламу да апавядання «Губаты» Генрыха Далідовіча.
- ✓ Прачытаць часткі 1—2 аповесці «Жураўліны крык» В. Быкава.

**V. Падвядзенне вынікаў урока. Каменціраванае выстаўленне адзнак. Рэфлексія.**

- ✓ Працягніце выразы: «Сёння на ўроку я зразумеў...», «Урок даў мне для жыцця...», «Пасля ўрока мне захацелася...».

(Агучваюцца вынікі работы.)